ЭКАНОМІКА

Вяртаем пазіцыі

У Магілёве міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ і намеснік міністра сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі Іван ЛЕБЕДЗЕЎ падпісалі прагнозныя балансы адносна малака і мясапрадуктаў на наступны год.

Расійскі бок запэўніў, што ў Беларусі будзе магчымасць адправіць у Расійскую Федэрацыю той аб'ём харчовых прадуктаў, які быў недапастаўлены раней.

Пра практычную рэалізацыю прынятых на форуме пагадненняў журналістам расказаў беларускі міністр Леанід Заяц:

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— На харчовы рынак Расіі ў 2019 годзе Беларусь у планавым рэжыме паставіць 320 тысяч тон мяса і мясапрадуктаў, 3 мільёны 710 тысяч тон малака і малочных прадуктаў. Гэта больш, чым летась, па мясе, напрыклад, на 11 працэнтаў. Лічу, што адкрытае абмеркаванне і стварэнне новых правілаў супрацоўніцтва выключаць магчымыя прэтэнзіі да якасці прадукцыі беларускіх вытворцаў. Не менш важна адкрытае ўзаемадзеянне ў сферы аграрнай навукі і адукацыі, інавацыйных распрацовак у селекцыі, стварэння тэхнічнага патэнцыялу новага пакалення.

З 1 ліпеня 2018 года пачала дзейнічаць сістэма электроннай сертыфікацыі тавараў жывёльнага паходжання «Меркурый», што робіць прасоўванне тавараў больш празрыстым і зразумелым.

Між тым на Форуме рэгіёнаў беларускія кампаніі АПК падпісалі кантракты на 123 мільёны долараў. А па выніках першага паўгоддзя 2018 года беларускія партнёры паставілі ў Расію сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання на суму 2055,5 мільёна долараў ЗША, ці больш за 82 працэнты ад усяго кошту экспарту гэтай групы тавараў. Доля імпарту беларускай малочнай прадукцыі ў Расійскую Федэрацыю перавышае 87 працэнтаў. Такі падыход адпавядае канцэпцыі Саюзнай дзяржавы, калі мы ў першую чаргу забяспечваем харчаваннем адно аднаго і, толькі калі яго не хапае, прыцягваем яго з іншых рынкаў.

ВОПЫТ

На сваім забеспячэнні

Харчовая бяспека Беларусі знаходзіцца на высокім узроўні і мае станоўчую дынаміку. На аднаго жыхара краіны ў 2017 годзе вырабляліся мяса ўдвая больш, чым у Расіі і Казахстане.

Па вытворчасці малака на душу насельніцтва Беларусь апярэджвае Казахстан у 2,5 раза, Арменію, Украіну і Расію — у 3-3,6 раза. У забеспячэнні харчовай бяспекі важная роля належыць вытворчасці збожжа, валавы збор якога (у вазе пасля дапрацоўкі) у 2017 годзе склаў 8 мільёнаў тон і перавысіў узровень 2010 года на 14,4 %.

Пакуль уборка ўраджаю яшчэ не скончана. На 1 кастрычніка валавы збор збожжа без кукурузы склаў 5,3, цукровых буракоў — 1,4, агародніны — 81,6 мільёна тон, бульбы — 580,3 тысячы тон.

У структуры рознічнага тавараабароту харчовыя тавары складалі 53 %. Насычэнне спажывецкага рынку харчовымі таварамі забяспечваецца ў асноўным за кошт вырабленага ў краіне. Сярод рэалізаваных арганізацыямі гандлю харчовых тавараў айчынныя складаюць 79,5 %, а па шэрагу тавараў попыт пакупнікоў практычна цалкам задавальняецца за кошт прадукцыі беларускіх вытворцаў.

Аб'ём экспарту харчовых тавараў склаў 2,837 мільярда долараў. Геаграфія паставак беларускіх прадуктаў налічвае 77 краін свету.

ВУЧОНЫ САВЕТ

Прарыўныя Горкі

Напярэдадні форуму ў аграрным універсітэце ў Горках адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя. Яе ўдзельнікі — вядучыя навукоўцы-аграрыі з Беларусі і Расіі, саюзныя парламентарыі, прадстаўнікі аграрнага бізнесу і мясцовых органаў улады — абмеркавалі і сфармулявалі тры прыярытэтныя напрамкі развіцця АПК Саюзнай дзяржавы.

Гэта: фарміраванне інавацыйных сістэм жывёлагадоўлі і стварэнне адзіных селекцыйна-генетычных цэнтраў, распрацоўка сістэмы машын сельскагаспадарчага прызначэння і ўкараненне на іх аснове сучасных рэсурса- і энергазберагальных тэхналогій у АПК, павышэнне якасці аграрнай адукацыі і сумесная падрыхтоўка кадраў.

— Усё гэта трэба, — лічыць Аляксандр Папкоў, — каб працаваць у аграрным сектары на апярэджанне і ісці ў нагу з часам, забяспечваючы харчовую бяспеку Саюзнай дзяржавы. Толькі сумясціўшы нашы інтарэсы, выпрацаваўшы правільныя і канкрэтныя кірункі работы, мы можам казаць пра тое, што мы — дзяржава, што мы не баімся ніякіх іншых санкцый.

Дарэчы, сёння ў беларускім АПК працуе 55,4 тысячы кіруючых работнікаў і спецыялістаў, ці 94 % ад патрэбы. Не хапае 3,6 тысячы чалавек, штогод выбывае 8 тысяч работнікаў, ці 14 %.

Узровень ведаў сучаснай вытворчасці кіраўнікоў і спецыялістаў недастатковы. Вышэйшую адукацыю маюць 45,5 % работнікаў. Акрамя таго, доля асоб пенсійнага ўзросту складае 26 %.

Такая ж сітуацыя і ў кадравым забеспячэнні аграрнай галіны Расійскай Федэрацыі.

Падрыхтоўку спецыялістаў для галіны ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляюць чатыры аграрныя ВНУ і 28 каледжаў. У арганізацыі АПК штогод размяркоўваецца каля 2 тысяч спецыялістаў з вышэйшай і 3,3 тысячы з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Марыя ПАЎЛОВІЧ.

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

ТРЫ КІТЫ ДЛЯ ВЁСКІ

На секцыі па аграрнай палітыцы Саюзнай дзяржавы ішла гаворка пра харчовую бяспеку дзвюх краін, пра лічбавізацыю аграрнага сектара і сумесную падрыхтоўку сучасных спецыялістаў для АПК.

Сярод галоўных кірункаў развіцця сельскай гаспадаркі ў Саюзнай дзяржаве **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, член Камісіі Парламенцкага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і ліквідацыі наступстваў аварый Аляксандр ПАПКОЎ** *(на фота)* называе «лічбавізацыю» аграрнага сектара:

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Гэта стварэнне адзіных селекцыйна-генетычных цэнтраў, укараненне ў аграрны сектар лічбавай эканомікі і дакладнага земляробства, павышэнне якасці аграрнай адукацыі кадраў, якія павінны рэалізоўваць гэтыя кірункі.

Профільная камісія Парламенцкага Сходу правяла сур'ёзную работу для канкрэтызацыі прыярытэтных кірункаў у АПК. І гэта дало свой плён. Як лічыць парламентарый, нарэшце з'явілася кансалідаваная думка ўсіх структур і ведамстваў:

— Гэта, перш за ўсё, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, які заняў каардынуючую пазіцыю ў рэалізацыі прапанаваных тэм, міністэрствы сельскай гаспадаркі Расіі і Рэспублікі Беларусь, і дэпутацкі корпус: сенатары Расіі і члены Савета Рэспублікі. Пытанні, якія сталі прыярытэтнымі ў нашай рабоце, жыццёва важныя — ад іх залежыць наша эканамічная і харчовая бяспека. І мы ставім перад сабой задачу: не пазычаць, а вырабляць і прапаноўваць, у тым ліку, на знешнія рынкі, свой прадукт, — Аляксандр Папкоў застаўся задаволены вынікамі магілёўскага форуму.

Старшыня камітэта Савета Федэрацыі Расіі па аграрна-харчовай палітыцы і прыродакарыстанні Аляксей МАЁРАЎ глядзіць у будучыню з аптымізмам. І яго не азмрочваюць тыя праблемы, якія перыядычна ўзнікаюць:

— Цалкам відавочна, што чым вышэйшы ўзровень адносін, тым больш складаныя задачы паўстаюць на шляху іх развіцця. Гэтыя новыя задачы патрабуюць пастаяннага ўдасканалення механізмаў супрацоўніцтва, пошуку новых фарматаў і магчымасцяў, як у галіне двухбаковых адносін, так і на міжнародным узроўні. Але, безумоўна: харчовая бяспека — найважнейшы кірунак нацыянальнай палітыкі, якая забяспечвае захаванне дзяржаўнасці і суверэнітэту кожнай краіны.

Аляксандр Папкоў нагадаў калегам, што Беларусь і Расія паставілі перад сабой амбіцыйную мэту: падвоіць да 2025 года ВУП. І, на яго думку, вырашыць яе без стварэння сумесных буйных вытворчасцяў, прамысловых кластараў, у тым ліку і ў АПК, — нерэальна.

У стратэгіі развіцця Расіі і Беларусі акцэнт на развіцці сельскіх тэрыторый і паляпшэнні якасці жыцця працаўнікоў. Рост экспарту прадуктаў харчавання на сусветныя рынкі, без зніжэння пры гэтым узроўню ўнутранага спажывання ялавічыны, малака, агародніны, немагчымы без прарыўных дзеянняў і стварэння дадатковай дабаўленай вартасці. На думку міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца, на дапамогу ў гэтым павінны прыйсці сучасныя інавацыйныя тэхналогіі.

> Гэта стварэнне адзіных селекцыйна-генетычных цэнтраў, укараненне ў аграрны сектар лічбавай эканомікі і дакладнага земляробства, павышэнне якасці аграрнай адукацыі кадраў, якія павінны рэалізоўваць гэтыя кірункі.

Высока ацаніў работу аграрнай секцыі форуму і статс-сакратар — намеснік міністра сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі Іван Лебедзеў. Ён лічыць, што «неўзабаве мы адмовімся ад практыкі падпісання балансаў паставак сельгаспрадукцыі. Мы павінны давяраць адно аднаму, а не ствараць дадатковыя бар'еры. Няма ніякіх падстаў для парушэння балансаў, падпісаных сёння. Мы створым неабходныя ўмовы, каб у Беларусі адчувалі сябе ў гэтых адносінах камфортна. Гэта лагічны вынік добразычлівых і ўзаемавыгадных адносін брацкіх краін».